ГУО « Жукневская детский сад –  базовая школа Толочинского района»

**Адкрыты ўрок**

**(у рамках метадычнага аб'яднання настаўнікаў пачатковых класаў)**

# Тэма:   Свет грыбоў. Правілы збору грыбоў.

**Настаўнік: С.В.Буйневіч**

**Тэма: Свет грыбоў. Правіла збору грыбоў.**

**Мэты:** 1. Фарміраваць уяўленні пра ядомыя і ядавітыя грыбы, іх значэнне ў прыродзе, правілы бору.

2.Развіваць цікавасць да вывучэння прыроды.

3. Выхоўваць беражлівае стаўленне да прыроды.

**Ход уроку:**

## Этап I . Арганізацыйна-матывацыйны этап

**Задачы этапу:**
**- стварэнне добразычлівай рабочай атмасферы,арганізацыя ўвагі вучняў;**

-Добры дзень!
Сёнешні наш урок я прапаную пачаць з верша пра нашу любімую школу.

*Залацістай раніцою*

*У клас мы радасна ідзём*

*Тут утульна , светла чыста.*

*Школа наш любімы дом.*

На кожную літару гэтага словазлучэння прыдумайце словы - пажаданні сваім сябрам , нашым гасцям.( дабра, бадзёрасці, радасці, здароўя, настрою,)
- З якім настроем вы пачынаеце наш урок?
Настрой я прапаную вызначыць на экране надво’я. Пастаўце фішку на малюнак які адпавядае вашаму настрою.
*\ Сонейка- настрой вельмі добры.Сонейка за хмаркаю- настрой не вельмі добры . Хмарка- працаваць няма настрою.*
Жадаю вам добрага настрою,а на ўроку
**У**- увагі.
**Р**- разуму .
**О**- добразычлівасці.
**К**- кемлівасці.

## Этап II. Актуалізацыя апорных ведаў .

-Сёння мы з вамі адпраўляемся ў лес. А для гэтага нам трэба добра ўяўляць што такое лес. *\Гэта месца, дзе шмат дрэў\. \слайд*

- Дакладней, гэта прыродная супольнасць, дзе растуць не толькі дрэвы і хмызнякі, але і травяністыя расліны, жывуць разнастайныя жывёлы.

.- Якое значэнне мае лес для прыроды? *(Дом для раслін і жывёл, ён дорыць кісларод для дыхання, захоўвае вадаёмы і глебу, мае лекавыя расліны, гэта крыніца вады і ежы).*

- А якое значэнне мае лес для чалавека? *(Месца адпачынку, крыніца вады, ежы, лекавых раслін і свежага паветра).*

Мы адпраўляемся ў лес. (Гучыць фанаграма «Галасы лесу»).



- Скажыце, калі ласка , а чаму я не ўключаю музыку грамчэй, каб было нам весялей гуляць у лесе? *(У лесе нельга шумець)*

- Давайце успомнім, што такое прырода?

*(Прырода - гэта тое, што нас акружае і не створана рукамі чалавека).* Адкрыв. Табл на дошке

- Якая бывае прырода? *(Жывая і нежывая).*

На дошцы з'яўляецца схема:

| Прырода |
|---|

| жывая | нежывая |
|---|---|

- Чым адрозніваецца жывая прырода ад не жывой? *(Дыхае, сілкуецца, расце, размножваецца і памірае).*

У мяне ёсць малюнкі. Давайце вызначым што трэба аднесці да жывой, а што да нежывой прыроды. Дапоўнім схему.*( сонца, камяні, пясок, вада, паветра, чалавек, расліны, жывёлы) \Дзеці выходзяць да дошкі ланцужком*

-На якія два свету можна падзяліць жывую прыроду? *(На свет жывёл і раслін).*

Схема на дошцы папаўняецца:

| Прырода |
|---|

| жывая | нежывая |
|---|---|

| расліны | жывёлы |
|---|---|

## Этап 3. Падрыхтоўка вучняў да працы на асноўным этапе ўрока

**Задачы этапу:**

**- забяспечванне разумення і ўсведамлення вучнямі тэмы ўрока; прыняцце вучнямі мэт урока.**

**Знаёмства з тэмай урока.**

У час нашай лясной прагулкі мы звярнём асаблівую ўвагу на тое, аб чым гаворыцца ў загадке :\слайд\ *“ Ніколі шапкі не здымае, бо ні адной рукі не мае.”*

Давайце карыстаючыся схемай разам сфармулюем тэму урока, акрэслім задачы і вызначым мэты.\слайд\

( На дошке плакат, на якім змешчана ўмоўная схема разважанняў.З яе дапамогай разам фармулюем тэму ўрока, акрэсліваем задачы вызначаем мэты.)

***На ўроку мы будзем…..***

***Знаёміцца ….***

***Вучыцца……***

***ацэньваць сябе і сяброў, УНД.***

## **Этап 4.   Тлумачэнне новага матэрыялу.**

- Сёння на ўроку мы перанясёмся ў думках ў лес, у асаблівае царства прыроды. Мы павінны высветліць з вамі дзе, калі і як трэба збіраць грыбы, якія з іх ядомыя і не ядомыя. Каб не заблудзіцца ў лесе з намі будзе падарожнічаць вось такі грыбок-прыгажун.

Як вы думаеце грыбы нашы сябры, або ворагі? Як бы вы адказалі  на гэта пытанне зараз? На гэта пытанне нам трэба даць адказ па заканчэнні ўроку. Будзьце вельмі ўважлівыя.



Свет грыбоў вельмі вялікі. На зямлі налічваецца каля 100 тыс.розных відаў грыбоў. Ёсць такія маленькія, што без мікраскопа іх не ўбачыць, хаця яны могуць вызываць хваробы чалавека, жывёл,раслін. А ёсць такія, што могуць знішчыць не тольць паваленыя дрэвы ,але і дамы. \слайд\ \Плесень\ Цвіль на хлебе і варэнні, дрожжы, якія кладуць у цеста - гэта таксама грыбы. З некаторых відаў **плесенных** грыбоў атрымліваюць лекі, якія спасаюць людзей ад смерці.  Ёсць грыбы –паразіты . Часцей за ўсё яны растуць на ствалах дрэў.\слайд\

Ёсць вельмі цікавыя па колеру, па будове - незвычайныя грыбы.\слайд\

- Існуе нават цэлая навука, прысвечаная  вывучэнню грыбоў. Яна называецца «Мікалогія». \На дошцы: Мікалогія\ «Мікас» - грыб, «Логас» - навука.

- Як можна перавесці "Мікалогія» з латыні? (*Навука аб грыбах).*

* *прачытаем уголас слова разам.*

* *колькі складоў у слове*

* *на які склад падае націск*

- Але сёння мы будзем весці размову аб грыбах, якія нам больш знаёмы. Так што ж такое грыбы , якія мы прывыклі збіраць у лесе?



- Можна  іх назваць жывымі? (Грыбы з'яўляюцца, нараджаюцца, растуць, паміраюць ...)
- А да якога света жывой прыроды можна аднесці грыбы? (Да света раслін).
- Чаму? (Яны растуць на зямлі).
- А якія часткі раслін нам вядомыя? (Корань, сцябло, галінкі, лісце, плод).

- Давайце разгледзем з якіх частак складаецца шапачкавы грыб.\слайд\

- Ці ёсць яны ў грыбоў? (У грыбоў няма лісця, сцябла, галінак).

- У такім выпадку ці можна з упэўненасцю аднесці грыбы да свету раслін? (Не).

- А да свету жывёл? (не).

- Так, што ж такое грыбы? Які вывад можна зрабіць? _\Гэта асобнае царства жывой прыроды_

Грыбы - гэта асобнае царства жывой прыроды, якое не адносіцца ні да свету раслін, ні да свету жывёл. Дапаўняюць схему на дошцы:

Прырода

жывая | нежывая

расліны | жывёлы

грыбы

Зараз давайце падрабязна разгледзем часткі грыба

- У шапачцы спеюць грыбныя споры, якія разносяцца ветрам, трапляюць на зямлю і прарастаюць, такім чынам з’яўляюцца новыя грыбы. Па ножцы да шапачкі цякуць спажыўныя рэчывы, якія грыб бярэ з глебы. А разам ножка і шапачка маюць назву «пладовае цела».



Другая частка грыба знаходзіцца пад зямлёй. З чаго яна складаецца? На што падобная? _(Складаецца з нітак, падобная на павуціну, карані)._

Падземная частка грыба называецца «грыбніца (міцэлія)» Грыбніца- гэта і ёсць сам грыб.Тое ,што на паверхні зямлі-гэта толькі плод.

- Паглядзіце на назву частак грыба і скажыце: як, па-вашаму, якая частка з іх выконвае больш важную ролю ў жыцці грыба? Чаму? (_Грыбніца важней, чым пладовае цела, таму што толькі грыбніца здольная вырасціць пладовае цела, без яе не будзе грыбоў)._

- А як грыб харчууецца? (_Грыбніца высасвае з глебы ваду з растворанымі ў ёй солямі)._



- Грыбы растуць групамі, сямейкамі, іх можна сабраць некалькі ў адным месцы. Як вы думаеце чаму? (Ніткі грыбніцы ўтвараюць складаную падземную павуціну, а на яе спляценнях прабіваецца уверх пладовае цела ) \ слайд\

Я ведаю што вы ўсе фантазёры. Уявіце сабе што надыйшло лета, за акном зялёная трава, прыгожыя кветкі, спяваюць птушкі. У лесе выраслі ягады і грыбы.

*Кошыкі возьмем*

*У лес знаёмы пойдзем*

*Грыбы мы зараз*

*Абавязкова знойдзем.*

- Паглядзіце на слайды і паспрабуйце правільна назваць грыбы.\слайд\

***

І палянку і гушчар любіць грыб.

Не грыб, а цар,

Самавіт ён і здароў- прыгажун сярод грыбоў.\ баравік\

Хто ў кусце лазовым, там дзе звонкі бор,- чырнагаловы, нібы памідор.\ падасінавік\

Спусціліся ў лясок і селі ў верасок

Улетку зоркі-знічкі, а іх завуць……\ лісічкі\

Па ствалах бярозак лазяць, не грыбы, аверхалазы.

І на пнях яны растуць,

Адкажы. Як іх завуць \ апенькі\



Цёплым летам у бары каля самай сцежкі:

- Нас у кошык забяры,- просяць….. \ сыраежкі\

- Вопытны грыбнік ведае грыбныя мясціны. Паглядзіце на дошку!

«Дубавік», «падбярозавік», «чырвонагаловік».

- Пра што гавораць назвы гэтых грыбоў? (Яны растуць пад асіна, дубамі і бярозамі).

грыбы вельмі сябруюць з пэўнымі дрэвамі і хмызнякамі і звычайна селяцца пад імі. Напрыклад, маслята - пад іглічнымі, белыя - пад дубамі ...

-Давайце ўспомнім скарагаворку пра баравікі. ” У лесе дзе дубкі стаяць баравікі”

* вымавіце яе хутка

Як можна назваць баравікі , якія растуць пад дубамі?

Дрэвы і грыбы вялікія сябры. Гэта сяброўства карысна і грыбам і дрэвам. Ніці грыбніцы зрастаюцца з каранямі дрэва і дапамагаюць ім усасываць з глебы ваду і солі. Узамен грыбы атрымліваюць ад раслін тыя спажыўныя рэчывы якія расліны утвараюць ад святла [цукар і крахмал]).

- Як разумееце народную пагаворку: «Усякі грыб у рукі бяруць, ды не ўсякі ў кошык кладуць»?

- Ці ўсё грыбы можна выкарыстоўваць у ежу? \Сярод іх бываюць атрутныя грыбы, якімі чалавек можа атравіцца.\



- Каля 25 відаў ядавітых грыбоў расце ў нашых лясах. Яны вельмі небяспечны.

- Паглядзіце на слайды і паспрабуйце правільна назваць ядавітыя грыбы.\слайд\

- Якія звесткі ёсць пра гэты грыб \ бледная паганка\. Карыстаемся падручнікам.\А\

***Фіз. мін.***

*Вожык ішоў,ішоў,ішоў*

*І грыбок знайшоў \ хадзьба*

*Падняў грыбок- паклаў у кузавок \нахіл*

-А зараз я буду называць грыбы.

Калі гэта ядомы грыб– вы знаходзіце аго і кладзёце ў кошык.

Калі ядавіты- разводзіце рукі ў стораны, паварочваеце галавой.

\ карыстаемся кошыкам і грыбамі\-лісічкі,сыраежкі,баравік,падасінавік..

- Скажыце чаму мы не паклалі у кошык мухамор , бледную паганку,несапраўдныя апенькі? Калі іх есці нельга то напэўна мы можам гэтыя грыбы збіць нагамі,або растаптаць? (Некаторыя грыбы з'яўляюцца лекамі для жывёл. Напрыклад, ласі могуць лячыцца мухаморы. А яшчэ дробныя жывёлы і птушкі п'юць ваду, якая збіраецца ў шапачках грыбоў).

- Добры грыбнік заўсёды збірае грыбы ў кошык.Як вы думаеце чаму? \Каб у час хадзьбы грыбы расейвалі па лесе свае споры, гэта будзе спрыяць таму што грыбоў у лясу вырасце больш./
- А яшчэ добры грыбнік заўсёды выконвае правілы збору грыбоў. Давайце пазнаёмімся з імі. \. Карыстаемся падручнікам.\

**- Этап 4. Замацаванне ведаў**

- Наш грыбок- прыгажун вельмі ўважліваслухаў вашы адказы. Ён прапануе пагуляць у гульню "Так ці не" і праверыць свае веды .

А пытанні свае ён запісаў на восеньскіх лісточках.



- Грыбы - гэта жывёлы?
- Грыбы - асаблівая царства прыроды.
- Самая важная частка грыба- шапачка.
- У шапачцы спеюць грыбныя споры, якія разносяцца ветрам, трапляюць на зямлю і прарастаюць, такім чынам з'яўляюцца новыя грыбы.
- Самая важная частка грыба – грыбніца.
- Грыбы ядавітыя – гэта мухамор, сыраежкі, паганкі.
- Бледная паганка- самы атрутны грыб.
- Дрэвы і грыбы вялікія сябры.
- Грыбы растуць групамі, сямейкамі, іх можна сабраць некалькі ў адным месцы.
- У прыродзе патрэбны ўсе грыбы і ядомыя і ядавітыя.

**Якое значэнне грыбоў у прыродзе?**

- іх любяць збіраць і ўжываць у ежу человек
- у іх насякомыя адкладваюць лічынкі
- Сваім коранем-грыбніцай всасываюць з глебы ваду з солямі і аддаюць яе дрэвам
- імі харчуюцца жывёлы. (Не толькі ядомыя, а таксама некаторыя ядавітыя грыбы.)

**<u>Слайд</u>**

-Паглядзіце на тех жывёл, якія харчуюцца грыбамі.

- У прыродзе ўсё узаемазвязана! Да яе тэба адносіцца беражліва.
Давайце успомнім верш- пажаданне і звярнёмся да ўсіх людзй нашай краіны.

*Мы жадаем, каб на зямлі нават самыя малыя*
*Шанавалі ,берaглі нашы радасці лясныя*
*Не чапалі мурашоў,будавалі дом шпачыны*
*Каб любілі край бацькоў,*
*Кожны кут сваёй Айчыны.*
*Мы збіраемся ўсе дружна на паляне ў крузе.*



**<u>Этап 5. Падвядзенне вынікаў урока і рэфлексія</u>**

- Наша падарожжа ў царства грыбоў падыходзіць да канца.

- Мы збіраемся ўсе дружна на паляне ў крузе.

Давайце усё ж такі адкажым на пытанне нашага ўрока “ Грыбы – гэта нашы сябры, або ворагі?”

*Вывод: Грыбы трэба добра ведаць, тады яны будуць для нас сябрамі.*

-А ў нашым класе ўсе сябры?

*У нашым класе ўсе сябры*

*У нашым класе я і ты*

*Усміхнісь таму .хто справа*

*Усміхнісь таму,хто злева*

*У нашым класе ўсе сябры*

*У нашым класе я і ты*

- Звернемся да *нашага* экрана настроя.Змяніўся ваш настрой? Пастаўце фішку на малюнак які адпавядае вашаму настрою. Я вельмі рада. Добрага ўсім дня.